ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
14 09 2017 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ПАД ЛУПАЙ ЭКСПЕРЫМЕНТА

Ну што, спрэчкі нарэшце скончыліся? Разам з летам. А то, памятаеце, яшчэ зусім нядаўна на ўсіх кухнях і ў курылках толькі і гучала: вой, холадна, вой, горача, дажджоў няма, дажджы пайшлі... («У інтэрнэце ныюць: «самотна летам дома сядзець», «лета праходзіць дарэмна» і г. д. Людзі, вы на працу ўладкуйцеся — і лета нават не заўважыце!») І тое праўда, калі ў цябе шмат работы, нюансы надвор'я — паняцце другаснае. («—Як вы правялі лета? — Позіркам...») Вось узяць хоць бы тых жа даследчыкаў, найперш, — у галіне чалавечых стасункаў. Ім што халадэча, што спёка — аніякай розніцы, шчыруюць на ніве кахання і сексу, як заведзеныя. («Назіраў тры дні за мурашнікам. Ні планёрак, ні нарад. І галоўнае — усе працуюць» .) Часам ужо так і хочацца сказаць словамі чэмпіёнаў Вышэйшай лігі, каманды КВЗ з БДУ пра сабачку, які дае малако: «Хопіць ужо, Сярожа!» А ён усё носіць і носіць...» І не спыніць жа навукоўцаў! Як тую жанчыну падчас спрэчкі! («Выдаляеш усе акаўнты, выкідваеш тэлефон, з'язджаеш жыць у вёску. Зімой уначы паштальён прыносіць табе пісьмо: «Я яшчэ не ўсё сказала!»)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Так, сёлетні год фактычна паставіў над усімі намі эксперымент па надвор'і. («Лета — гэта цудоўная магчымасць загараць, калі ідзеш на працу».) Дык вось, пакуль мы з вамі навіны «нябеснай канцылярыі» абмяркоўвалі, даследчыкі за нашымі спінамі такога «накруцілі»... («Ёсць цудоўнае выказванне: душы прыгожыя парывы... Дык вось «душы» — гэта дзеяслоў».) Паверце, нічога не маю супраць саміх навукоўцаў, нават крышачку зайздрошчу іх цяжкай, але такой цікавай працы! Гэта наймілейшыя людзі, улюбёныя ў сваю справу. («Шчаслівы чалавек — той, хто, вітаючыся, гаворыць «добрай раніцы» абсалютна шчыра, нават калі гэта раніца панядзелка».) Вось толькі вынікі іх высілкаў часам здзіўляюць. («Чым цішэй вір, тым больш прафесіянальныя ў ім чэрці».)

Напрыклад, апошнім часам многія вучоныя часта задумваюцца пра тое, ці можна займацца сексам у космасе. («— Я ўчора нападпітку была, ты не памятаеш, паміж намі нічога не было? — Не! Нічога не было! — Што ж табе так не шанцуе...») Па меркаванні навуковых супрацоўнікаў з Універсітэта Андэрсана (ЗША), заняцце каханнем у космасе прынясе партнёрам толькі непрыемныя адчуванні і галоўная прычына таму (увага, нечакана!) — бязважкасць і другі закон Н'ютана. Бог з ім (даруйце за каламбур), з апошнім, мяне галоўнае цікавіць — а дзе доказная база? Ніякіх спасылак на канкрэтныя добраахвотнікаў, адна сухая тэорыя. Ці ад нас штосьці хаваюць? («Лепшыя моманты ў жыцці чалавека адбываюцца па-за межамі сацыяльных сетак».)

Але вернемся на Зямлю, тут у нястомных даследчыкаў куды большае і разнастайнае поле для дзейнасці. Няхай сабе эксперыменты і традыцыйныя, галоўнае — абвясціць каторы раз пра іх вынікі. («Чарговы допінгавы скандал адбыўся на алімпіядзе па рускай мове».) Вучоныя з Каліфарнійскага ўніверсітэта апыталі жанчын ад 18 да 35 гадоў з нагоды ўпадабанага імі памеру мужчынскай годнасці. Не будзем пра даўжыню, калі коратка (зноў даруйце за каламбур), то для працяглых стасункаў можна і менш. Калі для адной ночы і экстрыму — больш. («Сёння свята ў дзяўчат, а заўтра будзе сорамна».)

Асацыяцыя амерыканскіх псіхолагаў пайшла далей і правяла ананімнае апытанне сярод жанчын розных сацыяльных груп і ў вялікім дыяпазоне ўзростаў (ад 28 да 55 гадоў) на тэму «Колькі сексу вам неабходна ў жыцці, каб адчуваць сябе сексуальна паўнавартаснай?») Вынікі ўразілі даследчыкаў настолькі, што аналагічныя эксперыменты правялі яшчэ ў шэрагу краін. Калі зноў жа без канкрэтных лічбаў («Усе ведаюць, што секс карысны для здароўя, але не ўсе ведаюць, што з 31-й хвіліны...») найбольш распаўсюджаны адказ паўсюдна гучаў так: чым больш, тым лепш! («Ва ўсіх жонкі як жонкі, а ў гэтай ніколі галава не баліць», — стомлена прашаптаў муж, зачыняючы за сабой дзверы ў спальню».) І быццам бы пад гэтыя выкладкі не падкапаешся — сур'ёзныя ж мужы працавалі. Хто ж падазраваў, што жанчыны заведзеныя на секс не менш за мужчын, як прынята лічыць. («Мне пара перасПаць думаць пра яе».) Але як жа жыццё? («— У цябе бываюць прыступы ляноты? — У мяне бываюць прыступы актыўнасці, лянота ў мяне пастаянная...») Гэта з аднаго боку. («Жонка мужу: «Зарплату атрымаў? Калі аддасі?» Сужэнец з яхідствам: «Пасля, сёння галава баліць...»)

А яшчэ ў інтэрнэце з'явілася аўдыябібліятэка... жаночых аргазмаў. Яе стваральнікі лічаць, што сексуальныя сцэны ў кіно і фільмах «для дарослых» сфарміравалі ў грамадстве няправільнае ўяўленне пра тое, як выглядае і гучыць у ложку жанчына. Маўляў, многія чакаюць ад партнёра нейкай тэатральнасці і вельмі здзіўляюцца, калі гэтага не адбываецца. Праект пазіцыяніруецца як асветніцкі: можна не толькі паслухаць чужое, але і дадаць свой трэк. («— Ало, пажарная? — Так. — У нас тут агонь! — Усё агонь? — Увогуле агонь! — Прыемнага адпачынку!»)

...Што я думаю наконт усіх гэтых эксперыментаў? Ды нічога, мной кіруе выключна «профільная» цікаўнасць. Бо кожны ў жыцці — сам ініцыятар і даследчык. («— Розачка, а што вы робіце сёння вечарам? Толькі не падумайце нічога такога... А калі падумаеце, дык як вам мая ідэя?») Гэта я так, у якасці той самай ідэі...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Робім тое, што ніхто не спрабаваў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Сярод музыкантаў зараз не прынята ствараць эпатажны імідж, ужываць алкаголь. У вас і назва такая — Intelligency. Адпачатку падкрэсліваеце: наша музыка інтэлектуальная для разумных людзей?

Юрый: — Гэта хутчэй стасуецца з музыкай, але не з намі самімі. Складана сказаць, што мы стрыманыя, правільныя.

Яўген: — Такія ж як і ўсе музыканты.

Усевалад: — Думаю, гэта хутчэй самаіронія. Так, мы хочам граць больш інтэлігентную музыку. Самі ж працуем у розных сферах — у абслугоўванні сувязі, будаўнічым праектаванні, абароне інфармацыі. Але гэта не перашкаджае музыцы. Яе лічым паўнавартасным заняткам па жыцці і часам дзеля яе ахвяруем працай.

— Вы граеце электронную музыку на англійскай мове, і досыць складана вызначыць яе, так бы мовіць, нацыянальную прыналежнасць. Часам крытыкі нават наракаюць: будзьце беларускімі, і вас тут палюбяць...

Усевалад: — У мяне на гэта вельмі просты адказ: хопіць прывязваць музыку да нацыянальнасці. Гэта тое самае, што казаць беларускім футбалістам гуляць «па-беларуску». Сапраўды, ёсць музыканты, якія адмыслова акцэнтуюць увагу на нацыянальным складніку творчасці, граюць архаіку. У нас няма такой задачы, мы эксперыментуем з творчым, а не з нацыянальным. Мы б хацелі пісаць музыку з нацыянальным каларытам і нават спрабавалі. Але гэта вельмі сур'ёзнае і намнога больш глыбокае пытанне. Тут бачыцца больш адказнасці. Тое, што многія спрабуюць спяваць па-беларуску, сапраўды добра, але трэба разумець, што сапраўдная беларусізацыя творчасці пачынаецца найперш з масавай культуры.

Юрый: — Мы ўжо некалькі гадоў выконваем песні на беларускай мове, і прынамсі адна з іх гучыць падчас кожнага выступлення. Яна проста арганічна атрымалася. Можам нават гадзінную праграму адыграць толькі па-беларуску.

Усевалад: — Кожную з гэтых песень рабілі вельмі доўга, выношвалі. Лічым гэта вялікай адказнасцю. Тут для нас арыенцір Уладзімір Мулявін. Ён выконваў песні шчыра, арганічна, і магчыма таму яны ўжо сталі легендамі. Але сучасны сыход у архаіку ці штучная беларускасць — ніяк не прыклад.

— У вашых анонсах ёсць абяцанні нейкага музычнага чараўніцтва, шаманства. Наколькі атрымліваецца вось так паўплываць на публіку?

Усевалад: — Магчыма, гэта прагучыць самаўпэўнена, але калі чалавек прыйшоў паслухаць музыку, проста акунуцца ў атмасферу, яе адчуць і зразумець, то ён на сто працэнтаў будзе з намі на адной хвалі і схопіць гэты «шаманскі» момант. Проста таму, што мы ведаем, што граем, даносім і самі гэта адчуваем. Усё залежыць ад ступені адкрытасці аўдыторыі. Астатняе ўжо ёсць у музыцы. Мы вельмі любім сваіх слухачоў і ганарымся тым, што на выступленні прыходзяць розныя людзі. Для нас няма такога паняцця, як мэтавы слухач. Кажуць, Intelligency слухаюць толькі хіпстэры. Гэта не так. У зале ёсць рабочыя з заводаў, людзі, якія па жыцці не слухаюць андэграўндную музыку, а нас любяць, ну і, канечне, хіпстэры.

— Сябе лічыце праектам андэграўндным? А ўвогуле, дзе мяжа паміж поп-музыкай і андэграўндам?

Усевалад: — У век інтэрнэту андэграўнднай творчасці проста не бывае. І ўсе гутаркі пра немагчымасць прабіцца да слухача бессэнсоўныя. Цяпер нават самы жорсткі хардкор-калектыў, які грае разбуральную музыку, становіцца мэйнстрымам. Іх могуць паслухаць усе, хто хоча. Інтэрнэт дае магчымасць паглядзець і паслухаць абсалютна ўсё. Андэграўнд памёр. Існуе музыка з шырокай і вузкай аўдыторыяй. Вось і ўсё.

— Але ўсё яшчэ прынята лічыць тэлебачанне мерай «зорнасці». Маўляў, трапіў туды — і мара здзейснілася.

Усевалад: — Але ж і ТБ сёння стала інтэрактыўным. На шоу да Урганта прыходзяць і Аксімірон, і Макс Корж. Яшчэ пяць гадоў таму гэта было б нонсэнсам, а сёння цалкам натуральна. І сведчыць пра тое, што паняцце субкультуры ў падполлі знікла. Напэўна, калі беларускае тэлебачанне таксама зразумее, што прыйшоў час паказваць творчасць, так бы мовіць, «нізоў», былы андэграўнд, тады сапраўды расквітнее беларуская масавая культура і пачнецца шчырая беларусізацыя творчасці.

— Міні-аркестрык паспеў сыграць на адной пляцоўцы з сапраўднымі зоркамі стылю, напрыклад, ONUKA, Tesla Boy і іншымі. Якім з гэтых суседстваў на сцэне ганарыцеся найбольш?

Усевалад: — Гучна сказана, гэта, хутчэй, проста радок у нашым партфоліа. Мы ганарымся кожным фестывалем, у якім удзельнічаем, незалежна ад «зорнасці» яго ўдзельнікаў. Паважаем усіх музыкантаў, з якімі выходзім на сцэну і любім слухаць кожнае з выступленняў. Незалежна ад таго, гэта хэдлайнер ці не. Напрыклад, 14 кастрычніка будзем прымаць удзел у фестывалі электроннай музыкі ў «Сталоўцы», дзе сыграем з іншымі беларускімі музыкантамі, на наш погляд вельмі цікавымі. І паслухаем кожны з гуртоў.

Юрый: — Напэўна, пытанне не ў суседстве і не ў складзе ўдзельнікаў. Для нас вельмі важна выступаць гэтак жа ярка, як і хэдлайнеры, граць гэтак жа добра, быць з імі на адным узроўні.

Усевалад: — Беларускія эксперты прадказвалі, што мы развалімся або заўсёды будзем заставацца калектывам другога гатунку, выступаць на разагрэве. З-за такіх прагнозаў таксама вельмі цікава працаваць і ўдасканальвацца. Набліжацца да пазіцый хэдлайнераў.

— Зразумела, што прадказаць, якім будзе ваша наступнае выступленне, немагчыма. А ці ведаеце, якім будзе наступны альбом?

Усевалад: — Ён будзе інтэлігентным *(смяецца)*. Па форме, канешне, не ведаем, якім. Але па сутнасці гэта ўсё роўна будзем мы.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 13.09.2017 г.